нумарах вобраз саламянай лялькі ўзнаўляецца харэаграфічнымі сродкамі і з дапамогай касцюма, які вырашаны ў залатым тоне і перадае фактуру і колер саломы.

Інтэрпрэтацыя ў харэаграфіі твораў керамікі магчыма ў тым выпадку, калі ў ёй увасабляюцца чалавек, жывёлы, птушкі, казачныя героі. Так, на наш погляд, беларускія харэографы павінны звярнуць увагу на ўдалы вопыт расійскіх балетмайстраў, якія скарысталі традыцыі рускай гжэлі для стварэння сцэнічнага калектыву "Гжэль". Рэпертуар яго насычаны нумарамі, дзе традыцыйны роспіс прысутнічае ў афармленні сцэнічных касцюмаў, і, акрамя гэтага, выкарыстоўваюцца асноўныя тыпажы фарфоравых статуэтак, якія ажываюць у танцавальных сюітах.

У беларускай сцэнічнай харэаграфіі можна знайсці прыклады выкарыстання мастацтва пляцення, напрыклад у нумары "Карункі" ў ансамблі "Белая Русь", дзе хараство карункаў адлюстроўваецца ў перапляценні малюнкаў і пластычнасці рухаў.

Такім чынам, сучасная беларуская харэаграфія звяртаецца да інтэрпрэтацыі твораў розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што спрыяе насычэнню танца яркімі, багатымі па змесце вобразамі. Балетмайстры запазычваюць выяўленчыя прыёмы, якія нараджаюць у гледача дадатковыя асацыяцыі пры ўспрыманні харэаграфічнага твора. Адначасова з далучэннем элементаў іншых відаў народнага мастацтва (тэатра, музыкі і песні, элементаў абрадаў і свят) гэта спрыяе стварэнню арыгінальных харэаграфічных нумароў і ўзбагачае нацыянальную харэаграфію.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.І.Непачаловіч,
*ст. выкладчык*

## АД МІНУЛАГА ДА БУДУЧЫНІ

Узровень нацыянальнай свядомасці залежыць ад адносін да культуры мінулага, ад традыцый і ўсяго таго,

што назапашана ў жыцці папярэднімі пакаленнямі. У культурнай спадчыне Беларусі асобнае месца займае менавіта народнае ткацтва, якое адлюстроўвае сувязь з даўнінай, з духоўнай культурай продкаў.

У майстэрні мастацкага ткацтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры вывучаюцца не толькі традыцыйныя спосабы і прыёмы рэмізнага ткацтва, але і вядзецца пошук новых шляхоў развіцця гэтага рамяства.

Асноўнымі мэтамі работы ў майстэрні з'яўляюцца набыццё студэнтамі прафесійных ведаў у галіне народнага ткацтва Беларусі і асэнсаванне, аналіз развіцця старадаўняга і сучаснага ўзорнага ткацтва нашай краіны.

Ва універсітэце выкладаецца тэарэтычны курс па гісторыі рэмізнага ткацтва, студэнты знаёмяцца з асаблівасцямі розных відаў вырабаў (сурвэтак, ручнікоў, абрусаў, посцілак, адзення і іншых бытавых рэчаў). Акрамя гэтага, дасканала вывучаецца матэрыял аб рэгіянальных асаблівасцях беларускага народнага ткацтва (які асартымент пераважае ў тканых вырабах вывучаемай галіны або раёна, асаблівасці тэхнік выканання, характарыстыка тканых вырабаў у беларускіх народных абрадах).

Паралельна з засваеннем розных тэхнік ткацтва (дзвюхнітовай, закладной, бранай, выбарнай, пераборнай, шматнітовай) на практычных занятках студэнты атрымліваюць веды па тэхналогіі рэмізнага ткацтва. У працэсе работы вядзецца размова аб класіфікацыі тканін з улікам сыравіны, аб асаблівасцях афармлення тканін з валокнаў розных відаў, уплыве на знешні выгляд тканіны шчыльнасці, аб фактурах і шматлікіх перапляценнях, тэхналагічных магчымасцях атрымання малюнка на тканіне і інш.

Вывучаюцца асновы кампазіцыі па ткацтве. Набываюцца веды аб рапарце малюнка, яго элементах, рытме ў малюнку, аб змене характару малюнка пры змяненні канфігурацыі яго элементаў. Студэнты засвойваюць паняцці зрокавай ілюзіі, сіметрыі, атрымліваюць веды аб маштабах, прапорцыях,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каларыстыцы, а таксама асаблівасцях у афармленні тканін і тканых вырабаў розных груп (адзенне, дэкаратыўныя тканіны, тканіны для інтэр'ера, сувенірныя тканіны і інш.).

Навучанне ў майстэрні мастацкага ткацтва, несумненна, дазваляе студэнтам стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Будучыя мастакі-выкладчыкі атрымліваюць адукацыю высокага прафесійнага ўзроўню, што ў далейшым дае ім магчымасць не толькі ствараць творы мастацтва, але і выхоўваць на іх лепшых узорах прадстаўнікоў маладога пакалення.

Н.В.Починова,
*преподаватель*

## СОХРАНЕНИЕ ТРАДИЦИОННОЙ РОСПИСИ В БЕЛАРУСИ

В настоящее время в школе больше внимания уделяют теории эстетического воспитания, чем практике. Вполне понятно, что на первый план должно выдвигаться изучение отечественной культуры и истории, так как именно эта область знаний содействует развитию нравственных чувств, пробуждению и укреплению национального самосознания. Однако для процесса обучения необходима и специальная практическая литература, необходимы учебно-методические пособия.

Ознакомление с белорусской росписью автора данной статьи началось в 1969 г., когда по настоянию и рекомендации В.С.Басалыги я прошла из конца в конец д.Огово, сделав десятки копий с сундуков, сохранившихся в ту пору на чердаках, в сараях.

На постижение всей прелести белорусской росписи ушло достаточно много времени, пока, наконец, стало понятно, что ее уникальность, самобытность, одухотворенность заложены в отработанных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ